УДК 94(476):27

# САКРАЛЬНЫЯ КАТЭГОРЫІ І СІМВАЛЫ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ АСОБЫ

**Шчэрбін Марына Міхайлаўна,**
Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна
(г. Мазыр, Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца светапоглядна-сімвалічныя канстанты патрыятычнага выхавання, што характарызуюць адносіны індывіда да сваёй сям'і, роднай зямлі і ўласных традыцый. Праз сакральныя сімвалы нашых продкаў раскрыты асаблівасці фарміраванні асобы прыхільнай пэўнай этнакультурнай супольнасці і каштоўнасным гістарычным здабыткам, што не старцілі сваёй значнасці і ў наш час.*

Фарміраванне асобы патрыёта абапіраецца на сістэму аксіялагічных дамінант, якія знаходзяць праяўленне на ўзроўні ключавых сфер рэалізацыі індывіда – асобасным, грамадскім, дзяржаўным. Кожная з гэтых сфер вызначае ўзровень уключэння чалавека ў сістэму складаных ўзаемасувязяў з найбліжэйшым асяроддзем, супольнасцю іншых людзей, дзяржаўнымі працэсамі; характарызуецца шэрагам сакральных катэгорый і сімвалаў, ўласцівых пэўнай этнакультурнай прасторы. Менавіта дадзеныя сакральныя арыенціры забяспечваюць пераемнасны характар патрыятычнага выхавання маладога пакалення, маюць значны інтэграцыйна-камунікацыйны патэнцыял.

Развіццё сістэмы патрыятычных адносін на асобасным узроўні з'яўляюцца ўмоўна дэтэрмінаваным абставінамі жыццядзейнасці чалавека. Гэты ўзровень найперш вызначаюць адносіны ўласна-патрыятычнага характару, якія адлюстроўвалі традыцыйна клапатлівае стаўленне індывіда да сям'і, продкаў, роднага дому як аснову ўласнай прыхільнасці да сваіх вытокаў. Такая прыхільнасць выступае формай пераемнасці і згуртаванасці асобы ў межах сямейна-родавай еднасці. Для старажытнага чалавека, паводле меркавання У.В. Колесава, нават само слова "род" – усё разам у адзінстве сэнсу і сімвала… нараджэнне, родзічы, Радзіма" [2, с. 28]. Пры такім разуменні прыярытэт кроўна-роднасных сувязей



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

на ўсходнеславянскіх землях разглядаўся натуральным фактарам выхавання маладых пакаленняў на традыцыях вернасці і адданасці Радзіме. Нашы продкі былі перакананы, што менавіта паважлівыя адносіны да сям'і і роду, як паказчык гарманічнага развіцця чалавека, былі стрыжнем фарміравання годнай асобы (*"Дрэва трымаецца каранямі, а чалавек сям'ёй"*), самарэалізацыі (*"Чалавек без сям'і, што дрэва без плоду"*) і нават самаідэнтыфікацыі асобы (*"Дзе сям'я, там і зямля свая"*) [3, сс. 116, 122, 329]. Прыхільнасць і адданасць сваім караням з'яўляліся не толькі крыніцай развіцця чалавека, але і асновай выхавання лепшых рыс і якасцей асобы патрыёта.

Адносіны прыродна-земляробчага характару, якія прадвызначылі цесную сувязь з зямлёй, прыродай, наваколлем грунтаваліся на прытрымцы ўстаноўленага побыту і ладу жыцця, забяспечвалі ўзнаўленне адпаведных архетыпаў дзеянняў, мадэляў паводзін. Акрамя важнага сацыяльна-эканамічнага патэнцыялу, неабходнага для існавання чалавека, вылучаныя адносіны мелі яскрава выражаны сакральна-міфалагічны характар увасаблення, які рэгламентаваў паўсядзённае жыццё асобы, утрымліваў значныя выхаваўчыя магчымасці. Як слушна адзначае А.І. Лысенка, аграрныя "формы рытуальнай камунікацыі" мелі найвялікшае значэнне для прывучэння чалавека да пэўнай сістэмы сэнсаўтваральных каардынатаў, сярод якіх адно з вядучых месц адводзілася беражлівасці і клопату, асэнсаванаму выкарыстанню роднай зямлі і прыроды [4, с. 134]. "Матэрыялізаваныя прыклады прыгажосці, дасканаласці, гармоніі чалавек знаходзіў у штодзённым яднанні з прыродай", што мела выключнае значэнне ў фарміраванні асобы патрыёта [1, с. 56]. Неабходнасць падтрымкі суладных узаемаадносін чалавека з навакольным асяроддзем у якасці вядучага жыццёвага канцэпту яго шчаслівага быцця абгрунтоўвалася ў фальклоры. Вусная народная творчасць клопат і каштоўнаснае стаўленне да наваколля дэманстравала ў выглядзе натуральных пачуццяў чалавека: *"Дзе воўк радзіўся, там і куст яму міл"*, *"Благая тая птушка, што свайго гнязда не пільнуе"*, бо *"Зямля родная – гэта калыска залатая"* [3, с. 87, 141, 161]. Такая экалагічна-патрыятычная скіраванасць дазваляла прыродна-земляробчым адносінам, нягледзячы на пераважна рацыянальны характар, захоўваць павагу да навакольнага асяроддзя як аснову існавання і развіцця асобы патрыёта.

Адносіны ідэйна-рэлігійнага (светапоглядняга) характару, якія рэгламентавалі паважлівае стаўленне да веры і вераванняў, традыцый, звычаяў і выступалі падмуркам фарміравання светаразумення чалавека. Панаванне звычаю захоўваць "няпісаныя правілы паводзін і маралі" надавала ўстойлівасць шэрагу грамадскіх інстытутаў, садзейнічала выхаванню прыхільнасці да традыцыйнай практыкі паводзін, падтрымцы іх пэўнай стэрэатыпнасці [5, с. 48]. Светапоглядна-арыентаваны і кансалідацыйны характар традыцыйнасці як важнага фактару змястоўнага напаўнення патрыятычнага выхавання бясспрэчны. *"Звычай мацней закона"* і *"Нядоўга той зямлі стаяць, дзе пачнуць уставы ламаць"*, – пагаджалася з гэтым і народная мудрасць [3, с. 216, 402]. Усходнеславянская рэлігійная традыцыя абумовіла спалучэнне аграрна-міфалагічных рудыментаў, каляндарнай і сямейнай абраднасці з хрысціянскімі каштоўнасцямі на беларускіх землях, што прадвызначыла іх выхаваўча-фарміруючую накіраванасць на асобу патрыёта. Па гэтай прычыне традыцыяналізм і імкненне да захавання ўласных



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звычаяў, абрадаў, вераванняў як прыкметы ўстойлівасці знаёмага ладу жыцця займалі важнае месца ў выхаванні патрыёта.

Яднанне з уласнымі каранямі, гарманічнае суіснаванне з прыродай, прыхільнасць звычаям і традыцыям з'яўляюцца вядучымі ў сістэме грамадзянска-патрыятычных адносін на асобасным узроўні. Гэта абумовіла перавагу каштоўнасных адносін да роду, зямлі, наваколля, накіраваных на гарманізацыю інтарэсаў чалавека, прыроды, грамадства ў якасці падмурка фарміравання асобы патрыёта.

Такім чынам, вылучаныя патрыятычныя адносіны на асобасным узроўні дэманструюць сувязь чалавека з Радзімай-зямлёй. Сувязь гэта мае лакальна-рэгіянальную накіраванасць, выступае ядром фарміравання якасных характарыстык асобы патрыёта; ёй ўласцівы эмацыянальна-пачуццёвыя формы прыхільнасці, любові, замілаванасці да сваёй Радзімы-зямлі. Дадзеныя сакральныя катэгорыі і сімвалы, характэрныя для беларусаў, не страцілі сваёй кансалідуючай накіраванасці і сёння, могуць быць выкарыстаны ў патрыятычным выхаванні маладога пакалення.

## Літаратура

1. Васильченко, Л.П. Природа славян / Л.П. Васильченко, Н.А. Чуднова. – Том. гос. ун-т, 2002. – 235 с.

2. Колесов, В.В. Древняя Русь: наследие в слове. Мир человека / В.В. Колесов. – СПб. : Филологический факультет Санкт-Петербургского государственного университета, 2000. – 326 с.

3. Лепешаў, І.Я. Тлумачальны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцевіч. – Гродна : ГрДУ, 2009. – 695 с.

4. Лысенко, О.И. Ритуалы аграрного цикла в белорусской этнокультурной традиции XIX–XX вв.: структура, функции, семантика : дис. … канд. ист. наук : 07.00.07 / О.И. Лысенко ; С.-Петерб. гос. ун-т. – СПб., 2002. – 253 с.

5. Чернявская, Ю.В. Народная культура и национальные традиции : пособие для учителей / Ю.В. Чернявская. – Минск : Беларусь, 2000. – 199 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова